***Поляк Н.А.***

# ДА ГІСТОРЫІ ВЫШЭЙШАЙ МЕДЫЦЫНСКАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ І РОЛІ ГРАМАДАЗНАЎЧЫХ НАВУК У ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТА МЕДЫКА Ў 50–70-Х ГГ. XX СТ.

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле гаворыцца аб асноўных накірунках работы кафедр грамадазнаўчых навук Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. На падставе аналізу пратаколаў паседжання кафедр марксізма-ленінізма, гісторыі КПСС і палітэканоміі за 50–70-я гг. XX ст. Зроблены высновы аб значэнні гуманітарных навук у станаўленні спецыяліста сістэмы аховы здароўя. Даказваецца, што савецкая ссістэма вышэйшай медыцынскай адукацыі, заснаваная на глыбокім вывучэнні грамадскіх навук, рыхтавала высокакваліфікаваных урачоў.

*Ключавыя словы: вышэйшая медыцынская адукацыя, Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, грамадазнаўчыя навукі, гісторыя БССР, студэнты медыкі.*

***Poliak N.A.***

# TO THE HISTORY OF HIGHER MEDICAL EDUCATION IN BELARUS AND THE ROLE OF SOCIAL SCIENCES IN THE PREPARATION OF A MEDICAL STUDENT IN THE 50-70 S XX C.

*Belarusian State Medical University*
*Minsk, Belarus*

**Abstract.** The main directions of work of the departments of social sciences of the Minsk State Medical Institute are considered in the article. Based on the analysis of the minutes of the meeting of the departments of Marxism-Leninism, the history of the CPSU and political economy for the 50-70s. Twentieth century to draw conclusions about the importance of the humanities in becoming a specialist in health care. Soviet higher medical education, based on a deep study of the social sciences, trained highly qualified physicians.

*Keywords: higher medical education, Minsk State Medical Institute, social sciences, history of the BSSR, medical students.*

Падрыхтоўка канкурэнтназдольных спецыялістаў з вышэйшай медыцынскай і фармацэўтычнай адукацыяй з’яўляецца галоўнай місіяй Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Выкладчыцкая і выхаваўчая праца накіравана на фарміраванне ў студэнтаў актыўнай жыццёвай пазіцыі і авалоданне навыкамі інавацыйнага мыслення. Усё гэта, на наш погляд, можа быць рэалізавана пры ўмовах спалучэння вопыту і традыцый з найноўшымі дасягненнямі навукі і педагогікі. Неабходна спалучаць вузкаспецыяльныя веды з агульнаўкацыйнымі, веды прыродазнаўчых навук з грамадазнаўчымі. Усё вышэй прыведзенае абумовіла выбар тэмы даследавання.

Галоўнай мэтай артыкула стала неабходнасць разгледзіць гісторыю вышэйшай медыцынскай адукацыі ў нашай краіне і падкрэсліць значнасць у ёй сацыяльна-гуманітарнага кампанента. Храналагічна артыкул ахоплівае перыяд з 50-х па 70-я гг. XX ст., што звязана з прынятым у гэты час агульнасаюзным адукацыйным стандартам вышэйшай школы і станоўчым вопытам падрыхтоўкі ўрачоў у Савецкай Беларусі.

Сярод задач вылучаны такія як: правядзенне аналізу пратаколаў паседжання кафедр з мэтай даследавання асноўных накірункаў работы са студэнскай моладзю; вылучэнне значэння сацыяльна-гуманітарных ведаў у адукацыі спецыялістаў аховы здароўя у БССР; вызначэнне ролі і месца кафедр грамадазнаўчых навук у агульнаўніверсітэцкай структуры.

Асноўнымі крыніцамі для напісання артыкула былі абраны пратаколы паседлжанняў кафедр марксізма-ленінізма, гісторыі КПСС і палітэканоміі Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута за 50-ыя 70-ыя гг. XX ст. Менавіта калектывы гэтых структурных адзінак забяспечвалі выкладанне сацыяльна-гуманітарных дысцыплін для студэнтаў медыкаў.

Аб асноўных накірунках дзейнасці кафедр мы можам меркаваць па павестцы дня пратаколаў паседжання. Гэты былі пытанні аб размеркаванні нагрузкі; абмеркаванне планаў і справаздач навуковай працы выкладчыкаў; аб методыках правядзення семінараў; абмеркаванне дысертацый і навуковых прац студэнтаў, планаў лекцыі [1]. Традыцыйна калектывы агаворвалі на паседжаннях колькасць гадзін па дысцыплінам і прадметам. Часта прадметам дыскусій станавіўся змест дысцыплін і методыкі іх выкладання, паспяховасць студэнтаў на занятках і на экзаменах. Трэба адзначыць, што вывучэнню дысцыплін «Гісторыя КПСС», «Навуковы камунізм», «Марксіска-ленінская этыка», «Гістарычны матэрыялізм», «Марксіска-ленінская філасофія», «Палітэканомія» надавалася значная ўвага, бо чыталіся яны ў аб’еме больш за 100 гадзін на II-IV курсах у 2-3 семестрах. Форма справаздачы прадугледжвалася найвышэйшая – дзяржаўны экзамен, экзамен, папярэдні залік і экзамен.

Калектывам кафедр прыходзілася рашаць пытанні супрацоўніцтва агульнага метадычнага кабінета і забеспячэння яго патрэбнымі нагляднымі матэрыяламі, навуковай і мастацкай літаратурай, хрыстаматыямі, тэматычнымі фільмамі і нават карыкатурамі па дысцыпліне “Навуковы атэізм”. Фігуравала ў дакументах інфармацыя аб значнасці для выхаваўчага працэсу правядзення конкурса студэнскіх канспектаў; тэматычных выстаў і канферэнцый.

Традыцыйным накірункам дзенасці была арганізацыя грамадска-палітычнай практыкі для 4-га курса. Сутнасць яе заключалася ў чытанні студэнтамі медыкамі лекцый на сацыяльна значныя тэмы для працоўных калектываў БССР. Тэматыка такіх сустрэч распрацоўвалася кафедрамі гуманітарных навук. Злабадзённым для працы выкладчыкаў было пытанне аб сродках і метадах актывізацыі самастойнай працы студэнтаў, набыцця нагляднага матэрыялу (карты, партрэты) мастацкай літаратуры (каб студэнты былі больш красамоўнымі) і пашырэння аўдыторнага фонду [4].

Досыць распаўсюджанай практыкай былі сумесныя пасяджэнне кафедр палітэканоміі, марксізма-ленінізма, гісторыі КПСС, нармальнай фізіалогіі,

замежнай мовы і іншых структур, якія забяспечвалі гуманітарную адукацыю і выхаванне студэнтаў [2]. Гэта дазваляла выпрацоўваць калектыўныя рашэнні актуальных задач і пераймаць вопыт. Значная ўвага выкладчыцкага калектыва была засяроджана на метадычнай працы, што вынікае са шматлікіх дыскусій і абмеркаванняў. Самым абавязковым элементам педагагічнага працэсу быў улік спецыфікі медыцынскага вну. Усе гуманітарныя навукі неабходна было выкладаць з улікам практычнай значнасці дадзненай навукі для спецыяліста сістэмы аховы здароўя. Прыводзіць прыклады блізкія студэнту-медыку, вучыць студэнтаў карыстацца ведамі для аналіза з'яў сучаснага жыцця. Падкрэслівалася значнасць самастойнай працы і неабходнасць яе належным чынам арганізаўваць [5].

Паколькі кафедры з'яўляліся паўнавартаснымі даследчымі калектывамі, вялікая ўвага надавалася навукі. На паседжаннях падвяргаліся крытычнаму аналізу артыкулы, дысертацыі, вынікі даследчай працы асістэнтаў, выкладчыкаў, дацэнтаў і прафесароў. Так, напрыклад, абмеркаванне доктарскай дысертацыі на кафедры марксіска-ленінскай філасофіі ў 1969 г. дацэнта Жукава М.І. на тэму «Проблема информатизации в философии и естествознании», скончылася звальненнем аўтара з працы па асабістаму жаданню [7].

Крыніцы даносяць да нас цяжкасці, якія паўставалі перад выкладчыкамі і педагогамі. На паседжаннях выпрацоўваліся рашэнні праблем: таемнага наведвання цэркваў і хрышчэння дзяцей, п'янства і курэння, антысанітарыі ў інтэрнанах, канфліктах, падтрымання шкодных традыцый, праслухвання замежнага радыё і інш. У пастанаўленнях прымаліся наступныя метады барацьбы: «организовать досуг методом проведения танцев, тематических встреч, чтения обзорных лекций по внешней и внутренней политике Советского Союза», «проводить разъяснительную работу по радио», «вовлекать студентов в научно-исследовательскую работу», «проводить вечера вопросов и ответов с иностранными студентами». Усё гэта дазваляла, на думку прысутных, умацаваць атэістычнае выхаванне, захоўваць калектывізм, чэснасць і прыстойнасць, разумна выкарыстоўваць вольны час і змагацца са спажывецкім стаўленнем да жыцця [8].

Такім чынам, пратаколы паседжання кафедр з'уляюцца каштоўнымі крыніцамі па гісторыі вышэйшай медыцынскай адукацыі ў Беларусі, таум што даваляюць ацаніць якое месца займалі сацыяльна-гуманітарныя веды ў падрыхтоўкі ўрача.

Кафедры гісторыі КПСС, марксізма-ленінізма, палітэканоміі ў поўнай меры забяспечвалі падрыхтоўку студэнтаў-медыкаў у такіх галінах навукі як філасофія, гісторыя, этыка, эканоміка і інш. Працягласць вывучэння прадметаў (2 семестры) і форм заліку (дзярж.экзамен, экзамен, залік і экзамен) сведчаць аб тым, што сацыяльна-гуманітарная адукацыя спецыяліста аховы здароўя была фундаментам станаўлення маладога чалавека як асобы, грамадзяніна, патрыёта. Дапамагала фарміраванню прафесійных навыкаў і здольнасцей, навучала самастойнаму навуковаму пошуку, вядзенню дыскусіі, асновам аратарскага майстэрства і нават каліграфіі. Удзел студэнтаў у канферэнцыях і выконванне грамадска-палітычнай практыкі садзейнічалі набыццю навыкаў публічных

выступленняў, наладжванню камунікацый з насельніцтвам, разуменню злабадзенных праблем савецкіх грамадзян, якія ў сваю чаргу ўплывалі на іх стан здароўя. Нельга не падкрэсліць значны аспект у выхаванні студэнтаў медыкаў пазітаўных адносін да працы (сельскагаспадарчай у тым ліку), адказнасці, стараннасці, калектывізму, паліткарэктнасці, павагі да старэйшага пакалення і сваіх настаўнікаў.

Кафедры марксізма-ленінізма, гісторыі КПСС і палітэканоміі, былі неад’емнай часткай медыцынскага вну і часткай вялікага калектыва, які самааддана працаваў над падрыхтоўкай медыцынскіх кадраў. Пры гэтым калектывы кафедр валодалі дастатковай колькасцю паўнамоцтваў і працавалі як самастойны арганізм. Выконвалі шэраг спецыфічных функцый і задач.

Працэсы сусветнага грамадска-палітычнага развіцця ўнеслі істотныя змены ў функцыянаванне сістэмы аховы здароўя. Паспяховасць працы медыка сёння цалкам залежыць ад яго здольнасцей разумець і аналізаваць заканамернасці развіцця грамадства. Відавочна, што паглыбленне зместа гуманітарных ведаў, пашырэнне варыятыўнасці дысцыплін дазволяць істотна ўмацаваць сістэму аховы здароўя краіны і папоўніць яе высокакваліфікаванымі кадрамі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 218. – Воп. 7. – Спр. 19. – Арк. 23.
2. НАРБ. – Спр. 277. – Арк. 7.
3. НАРБ. – Спр. 19. – Арк. 23.
4. НАРБ. – Спр. 79. – Арк. 16.
5. НАРБ. – Спр. 19. – Арк. 24.
6. НАРБ. – Спр. 277. – Арк. 9.
7. НАРБ. – Спр. 79. – Арк. 20.
8. НАРБ. – Спр. 79. – Арк. 42.